Т а б л и ц а 1 — Сравнение данных результатов начального и контрольного этапов эксперимента




1 — результаты начального этапа эксперимента; 2 — результаты контрольного этапа эксперимента

**Заключение.** Анализ эффективности использования данного комплекса упражнений позволил сформулировать вывод о том, что разнообразные задания, связанные с осуществлением определенных логических операций, способствуют обогащению и активизации словарного запаса младших школьников, повышению их речевой активности, развитию интеллектуальных способностей обучающихся. Очевидно, что для того чтобы достичь устойчивых результатов, эту работу необходимо осуществлять систематически, последовательно, целенаправленно не только на уроках русского языка, но и на других учебных предметах.

**Список цитируемых источников**

1. *Гальперин, П. Я.* Введение в психологию : учеб. пособие для вузов / П. Я. Гальперин. — М. : Университет, 1999. — 332 с.
2. *Коваль, А. П.* Методика преподавания русского языка в школах с украинским языком обучения / А. П. Коваль. — Киев : Выщ. шк., 1989. — 311 с.
3. *Тихомирова, Л. Ф.* Развитие интеллектуальных способностей школьника / Л. Ф. Тихомирова. — Ярославль : Аккад. развития, 1997. — 240 с.
4. *Левитес, В. В.* Развитие логического мышления детей дошкольного и младшего школьного возраста / В. В. Левитес // Изв. Рос. акад. образования. — 2006. — № 3. — С. 100—104.
5. *Дембицкая, Н. В.* Методика интеллектуального развития младших школьников на уроках русского языка / Н. В. Дембицкая, Е. А. Обухова, Г. А. Бакулина ; под ред. Н. В. Дембицкой. — М. : Владос, 2006. — 280 с.

УДК 821.161.3:82-93 Марозаў

**А. У. Шлег**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ЗМІТРОК МАРОЗАЎ ЯК ДЗІЦЯЧЫ ПІСЬМЕННІК

**Уводзіны.** Дзіцячая літаратура выконвае розныя выхаваўча-пазнавальныя функцыі. Пісьменнікі разумеюць важнасць творчасці для дзяцей, бо ў малым узросце закладаюцца ўяўленні аб законах светабудовы, паводзінах чалавека ў грамадстве, аб нацыянальных каштоўнасцях, экалагічнай культуры, валеалагічных прынцыпах. Усе жыццёвыя прынцыпы юны чытач спазнае праз ясную, даходлівую, эстэтычна дасканалую мову мастацкай літаратуры, якая валодае вялікім арсеналам тропаў, сінтаксічна-стылістычных фігур, прыёмаў гукапісу, а таксама багаццем форм. Амаль што кожны беларускі пісьменнік разумеў важнасць творчасці для дзяцей. Яе набыткам сталі творы класікаў: Ф. Багушэвіча, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, М. Танка, Р. Барадуліна. Жаданне пісаць для дзяцей з’явілася і ў сучаснага беларускага паэта Змітрака Марозава, але яно рэалізавалася ў жанры апавядання. Творца выдаў дзве кнігі апавяданняў для дзяцей: «Азбука агранома Валошкі», «Пра гарох і буракі, бульбу, жыта, агуркі…».

**Асноўная частка.** Змітрок Марозаў прайшоў доўгі і складаны шлях перад тым, як стаць пісьменнікам. У 1970 годзе ён паступіў на агранамічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, атрымаў прафесію агранома і працаваў старшым аграномам Упраўлення сельскай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкама, пэўны час займаў пасаду памочніка міністра сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Агранам — гэта хлебароб, значыць, сейбіт. Гэтай прафесіі З. Марозаў застанецца верны назаўсёды, стаўшы сейбітам разумнага, добрага, вечнага. Але на паэтычнай сяўбе, як і ў ва ўсякай іншай справе, важна не толькі тое, што ты сееш, але і як ты гэта робіш, з якім майстэрствам, уменнем, якія прыёмы пры гэтым выкарыстоўваеш. Паэт вырашыў напісаць кнігу для дзяцей пра тое, што расце на зямлі [4, с. 1].

© Шлег А. У., 2019

Важная асаблівасць дзіцячай літаратуры — яе сувязь з педагогікай і псіхалогіяй. Аўтар не стане дзіцячым пісьменнікам, калі ў душы не з'яўляецца педагогам. Кнігі З. Марозава «Азбука агранома Валошкі» і «Пра гарох і буракі, бульбу, жыта, агуркі…», прызначаныя для дзяцей і падлеткаў, маюць вялікі выхаваўчы і пазнавальны патэнцыял. Аўтар не проста апісвае расліны, але згадвае звязаныя з імі паданні, прыказкі, звяртаецца да гісторыі іх паходжання. Так падаюцца ў кнізе звесткі пра лён: «Яшчэ ў глыбокай старажытнасці нашы продкі з валокнаў ільну выраблялі палатно, вілі вяроўкі, шпагат. З палатна людзі шылі адзенне, а з ільняных нітак плялі мярэжы. Імі лавілі рыбу ў глыбокіх паўнаводных рэках і азерах. Лён не толькі апранаў нашых продкаў, але і карміў іх. А колькі шчырых народных песень прысвечана яму! Усіх не злічыць!» [2, с. 36].

З. Марозаў называе жыта сонцам жыцця. З гэтай самай пашаноўнай раслінай звязана некалькі міфаў. Адзін з іх аб тым, што людзі выявіліся няздольнымі ацаніць гэты падарунак Белбога, за што ён іх ледзь не пакараў. У народных уяўленнях расліны нярэдка паўстаюць як жывыя істоты: яны адчуваюць, дыхаюць, гавораць з людзьмі, а тыя іх разумеюць [7, с. 40].

Аўтар выкарыстоўвае анімізм у апісанні асобных раслін і культур. Гэтай мэце актыўна служыць перыфраза. З. Марозаў карыстаецца анімізмам пры апісанні агуркоў: «Паступова, адзін за адным патухаюць на агародзе жоўтыя агеньчыкі «агурочных святлафораў». І на іх месцы з'яўляецца маленькі агурок. Шурпаты, калючы, ён нясмела выглядвае з-пад шырокага ліста. Праз два-тры тыдні агурок патаўсцее, выцягнецца ў даўжыню. Ляжыць ён на градцы, нібы запрашае — бяры меня, еш!» [3, с. 6]. Анімізм — вера ў духаў, адухаўленне сіл прыроды, жывёл, раслін, прыпісванне ім розуму — моцна паўплываў на метафарычнсць мовы, фарміраванне паэтыкі фальклору, а затым і літаратуры [6, с. 25].

У апавяданні пра васількі пісьменнік згадвае і міфічных істот, напрыклад Цэрэру. Гэта рымская багіня сілаў зямлі, росту і паспявання збожжа, а таксама падземнага свету, якая магла насылаць на людзей хаос. Але яна таксама з'яўляецца багіняй мацярынства і шлюбу. Цэрэра ўшаноўвалася як зберагальніца ўраджаю, вартаўніца ад злодзеяў. Таму земляробы ставіліся да яе з вялікай павагай [5, с. 616]. «Аднойчы багіня ўрадлівасці Цэрэра, блукаючы сярод палёў, пачула самотныя галасы васількоў. Яны скардзіліся, што хлебаробы хочуць адлучыць іх ад жыта. Цэрэра шчыра паспачувала бездапаможным кветкам і заступілася за іх. З гэтага часу, вырашыла яна, у васількоў, якія растуць побач з жытнёвымі каласамі, будзе сваё прызначэнне: аздабляць снапы на свяце ўраджаю» [2, с. 17].

Кніга «Азбука агранома Валошкі» была выдадзена ў 1989 годзе. Яна складаецца з шэрагу апавяданняў пра найбольш распаўсюджаныя на Беларусі агародныя, палявыя і лугавыя расліны. З. Марозаў нездарма выбраў жанр апавядання, якое прыйшло ў літаратуру з вуснай народнай творчасці і дамінуе сярод жанраў сусветнай літаратуры. Апавяданне мае лаканічную форму, нескладаную кампазіцыю, засноўваецца звычайна на адным эпізодзе, асобнай падзеі або здарэнні з жыцця героя [1, с. 22]. У кнізе «Азбука агранома Валошкі» пісьменнік расказвае нам пра свайго добрага знаёмага — агранома, які вельмі любіць сваю працу, цікава і займальна расказвае пра самыя розныя і карысныя расліны, пра тое, колькі трэба старання, каб іх выгадаваць. Ён, Валошка, ведае не толькі краскі ў полі і лузе, але і даўнія прыметы, звязаныя з імі. Напрыклад, гайдаецца на ветрыку ў жыце звычайная сцяблінка званцу. Недасведчаны чалавек пройдзе і не зверне на яго ўвагі. Але аграном Валошка ведае народную прымету: «У жыце званец — лету канец» [2, с. 3].

Кніга «Пра гарох і буракі, бульбу, жыта, агуркі…» з'яўляецца працягам знаёмства з раслінамі Беларусі. Яе пісьменнік прысвячае сваім бацькам Веры Паўлаўне і Дзмітрыю Васільевічу, якія ўсё жыццё працавалі на зямлі. Усе апавяданні, а таксама паэтычныя радкі аб раслінах асветлены чалавечай дабрынёй, любоўю да роднай прыроды, неадольным імкненнем зберагчы яе ад разбурэння.

**Заключэнне.** Апавяданні З. Марозава, напісаныя для дзяцей, маюць пазнавальны і выхаваўчы характар, што адпавядае задачам дзіцячай літаратуры. Аўтар заклікае шанаваць нашых «зялёных сяброў», згадвае разнастайныя сюжэты з сусветнай і беларускай міфалогіі, актыўна выкарыстоўвае анімізм, метафарычнасць як сродкі мастацкай выразнасці.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Лазарук, М. А.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў : дапам. для настаўнікаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — Мінск : Нар. асвета, 1983. — 191 с.
2. *Марозаў, З.* Азбука агранома Валошкі : [апавяданні для дашкольнага ўзросту] / З. Марозаў. — Мінск : Юнацтва, 1989. — 63 с.
3. *Марозаў, З.* Пра гарох і буракі, жыта, бульбу, агуркі… : для дашк. і малод. узросту / З. Марозаў. — 2-е выд. — Мінск : Ураджай, 1998. — 95 с.
4. *Марозаў, З.* Апакаліпсіс душы = Апокалипсис души: Вянок вянкоў санетаў / З. Марозаў ; пер. на рус. мову А. Цяўлоўскага ; уступ. і заключ. арт. В. Рагойшы. — Мінск : Канфіда, 2006. — 504 с.
5. Міфалогія беларусаў : вучэб. дапам. / А. А. Шамак. — Мінск : БДПУ, 2005. — 187 с.
6. Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. — М. : Совет. энцикл., 1988. — Т. 2. К—Я. — 719 с.
7. *Шамякіна, Т. І.* Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т. І. Шамякіна. — Мінск : Маст. літ., 2000. — 400 с.